**Водзыў**
на аўтарэферат дысертацыі
Старасценка Таццяны Яўгеньеўны
**«Дынаміка беларускага мастацкага тэксту XX стагоддзя: лексіка-граматычныя сродкі, камунікатыўныя мадэлі і іх узаемадзеянне»,**
прадстаўленай на саісканне вучонай ступені доктара філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.02.01 — беларуская мова

Зыходзячы са зместу аўтарэферата, які адлюстроўвае мэту, задачы, асноўныя метадалагічныя пазіцыі і палажэнні дысертацыйнай работы Т. Я. Старасценка, агульнага погляду на актуалізаваную аўтарам праблему, можна сцвярджаць, што дысертацыя, прадстаўленая на атрыманне вучонай ступені доктара філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 — беларуская мова, з’яўляецца глыбокім і грунтоўным даследаваннем і характарызуецца навуковай навізной. Паводле аўтарскага вызначэння, навізна даследавання заключаецца «ў распрацоўцы новага падыходу да разгляду камунікатыўнасці мастацкага тэксту на аснове імпліцытнай знешняй і ўнутранай дыялагізацыі, якая стварае эфект сутворчасці паміж прадуцэнтам і рэцыпіентам у паэтычным тэксце, а таксама кантакт паміж рознымі суб’ектамі празаічнага наратыву» (с. 3).

Актуальнасць заяўленай праблемы — цікавай, складанай, значнай для стварэння цэласнай стылістычнай карціны беларускага мастацкага тэксту XX ст., — таксама пераканаўча абгрунтавана аўтарам дысертацыі і не падлягае сумненню. У прыватнасці, Т. Я. Старасценка слушна адзначае, што «патрабуюць лінгвістычнага паглыблення літаратуразнаўчыя ўяўленні пра асаблівасці эфектаў супастаўлення і супрацьпастаўлення, інтэрпрэтацыйнай дзейнасці адрасата, дэкадзіраванне твора… ролю прыёмаў суб’ектывацыі ў стварэнні камунікатыўнай перспектывы твора і рэалізацыі ўнутрытэкставага дыялогу» (с. 1).

У якасці аб’екта і матэрыялу даследавання саіскальніца вызначае паэтычныя і празаічныя тэксты беларускай мастацкай літаратуры XX ст. Прадметам даследавання выступіла сістэма лексіка-граматычных сродкаў, камунікатыўных мадэлей і іх узаемадзеянне.

Дакладна сфармулявана мэта даследавання — выявіць моўныя сродкі эксплікацыі дынамікі беларускага мастацкага тэксту XX ст., устанавіць асаблівасці ўзаемадзеяння камунікантаў паэтычнага і празаічнага дыскурсу, раскрыць падабенства і адрозненне ідыястыляў пісьменнікаў розных часавых перыядаў. Яе дасягненню падпарадкавана паслядоўнае рашэнне шэрагу задач, чым абумоўлены змест дысертацыі і яе структура.

Паводле асноўнага зместу, прадстаўленага ў аўтарэфераце, Т. Я. Старасценка ўлучае ў кантэкст дысертацыйнага даследавання вялікі аб’ём

паэтычных тэкстаў і ўзораў празаічнага наратыву. Для навуковага аналізу абраны творы Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, У. Жылкі, А. Гаруна, А. Куляшова, Е. Лось, Г. Пашкова, Н. Мацяш, М. Мятліцкага, М. Танка, П. Панчанкі, Н. Гілевіча, Р. Барадуліна, М. Гарэцкага, К. Чорнага, М. Зарэцкага, Я. Брыля, І. Шамякіна, В. Быкава, А. Васілевіч, В. Адамчыка, Г. Марчука. Аналіз сабранага і сістэматызаванага эмпірычнага матэрыялу завяршаецца высновамі агульнатэарэтычнага характару.

Абгрунтаванасць і верагоднасць асноўных вынікаў даследавання, выкладзеных у аўтарэфераце, забяспечваюцца навукова-аналітычным асэнсаваннем выбранага факталагічнага і тэарэтычнага матэрыялу. Саіскальніца адэкватна ацэньвае магчымасці наяўнага тэарэтыка-метадалагічнага інструментарыю адносна вылучаных аб’екта і прадмета, ставіць і вырашае навукова-значныя задачы на аснове выкарыстання функцыянальна-стылістычнага, апазіцыйнага, семіятычнага, структурнага, семантыка-стылістычнага, супастаўляльна-стылістычнага метадаў, кантэксталагічнага і кампазіцыйнага аналізу.

Нельга не адзначыць грунтоўнасць разваг і высноў дысертанткі пра ролю ў паэтычным дыскурсе XX ст. звароткa як ядра асацыятыўна-сэнсавага поля; пра найбольш актуалізаваныя бінарныя апазіцыі і характар іх вобразнай рэпрэзентацыі; пра асаблівасці ўзаемадзеяння ўнутрытэкставых камунікантаў празаічнага мастацкага наратыву; пра формы моўнай рэпрэзентацыі камунікатыўных мадэлей аўктарыяльнага і дыегетычнага наратываў.

Слушнай з’яўляецца думка пра арыентацыю камунікатыўнай стылістыкі мастацкага тэксту «на дыялагічнасць, якая наладжвае сутворчасць паміж пісьменнікам і чытачом» (с. 1). Канцэпцыя аналізу камунікатыўных мадэлей імпліцытнага дыялогу, прапанаваная ў дысертацыі, адкрывае новыя магчымасці інтэрпрэтацыі мастацкага тэксту ў працэсе выкладання тэорыі і гісторыі літаратуры, філалагічнага аналізу, а таксама пры напісанні навуковых работ рознага ўзроўню, у тым ліку ў кантэксце навуковай праблемы міждысцыплінарных узаемасувязей.

У цэлым варта адзначыць навуковую значнасць выкананай Т. Я. Старасценка работы, вынікам чаго стала распрацоўка новага напрамку камунікатыўнай стылістыкі мастацкага тэксту — дыялагічнай стылістыкі.

Разам з тым, пажадана ўдакладніць асобныя пазіцыі гэтага змястоўнага даследавання.

1. Аўтар дысертацыі сцвярджае: «Моўная рэпрэзентацыя камунікатыўных мадэлей аўктарыяльнага і дыегетычнага наратыву XX ст. у многім вызначаецца індывідуальна-аўтарскім стылем» (с. 33). Якія

тэкстапараджаючыя дамінанты ў цэлым/у сукупнасці абумоўліваюць падабенства і адрозненне ідыястылю пісьменнікаў розных часавых перыядаў?

2. Ці вылучаліся саіскальніцай камунікатыўныя мадэлі ў творах менавіта *ваеннай* прозы М. Гарэцкага і В. Быкава, якія адносяцца да розных перыядаў? Калі так, то якія сродкі іх моўнай рэпрэзентацыі агульныя ў гэтых аўтараў і якія — адметныя?

Такім чынам, на падставе тэксту аўтарэферата можна канстатаваць, што дысертацыйнае даследаванне «Дынаміка беларускага мастацкага тэксту XX стагоддзя: лексіка-граматычныя сродкі, камунікатыўныя мадэлі і іх узаемадзеянне» з'яўляецца завершанай кваліфікацыйнай работай, якая характарызуецца актуальнасцю, навуковай навізной, тэарэтычнай і практычнай значнасцю, а яе аўтар Т. Я. Старасценка вартая прысуджэння вучонай ступені доктара філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 — беларуская мова.

Доктар філалагічных навук, дацэнт,
прафесар кафедры філалогіі
ўстановы адукацыі
«Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт» А. І. Белая

Подпись Белой Е.И. удостоверяю
Начальник ОДО Н.Н. Лауш
Министерство образования Республики Беларусь * Учреждение образования «Барановичский государственный университет» * Брестская область, г. Барановичи
Отдел документационного обеспечения